Падтрымай "Вясну" на PATREON

Актывіста, які гаворыць шэптам, аштрафавалі за «гучную лаянку»

14.04.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Прадстаўнік Беларускага незалежнага прафсаюзу РЭП Віктар Казлоў. Фота Радыё Свабода

Тамара Застаўнецкая, суддзя Гомельскага раёну, пасьля абвяшчэньня пастановы пра штраф рэгіянальнаму прадстаўніку прафсаюзу РЭП Віктару Казлову сыходзіла з залі паседжаньняў подбегам. Прысутныя ў залі праводзілі яе воклічамі: «Ганьба! Люстрацыю!».

13 красавіка, пасьля чатырох паседжаньняў, Застаўнецкая пакарала Казлова штрафам: дзьвюма базавымі велічынямі — за «гучную лаянку» (артыкул 17.1 КаАП) і яшчэ дзьвюма — за непадпарадкаваньне міліцыі (артыкул 23.34).

Па інфармацыі "Гомельскай Вясны", пакараньні судзьдзя склала з частковым пагашэньнем і канчаткова абвясьціла пра штраф у памеры трох базавых велічынь, што складае 69 рублёў:

«Для мяне гэты суд быў зьвязаны з маральнымі і фізычнымі пакутамі, — шэпча Віктар Казлоў. — Гучна лаяцца я ў прынцыпе не магу. Пасьля апэрацыі ў анкалягічным цэнтры голас страціўся. Сёньня судзьдзя выклікала лекара-анколяга даваць тлумачэньні, ці зьвяртаўся я ў паліклініку з прычыны страты голасу, ці магла на гэта паўплываць перанесеная апэрацыя. Апрача таго, я прынёс мэдычнае

заключэньне ад 13 красавіка, у якім пазначана: падчас апэрацыі быў зроблены парэз мышцаў гартані. Лекар пацьвердзіў, што парэз, найхутчэй, прывёў да парушэньня голасаўтварэньня, пра гэта павінны дакладней сказаць лор альбо фаніятар. І ўсё адно судзьдзя прысудзіла штраф. Думаю, каб зьняць усе пытаньні пра лжэсьведчаньне амапаўцаў, якія абвінавацілі мяне ў гучнай лаянцы. Нічога не сказана ў пастанове і пра двое сутак арышту, якія я прэвэнтыўна адбыў 25–27 сакавіка».

Актывіста РЭП Віктара Казлова амапаўцы палку патрульна-паставой службы УУС Гомельскага аблвыканкаму **Аляксандар Сярдзюк**, **Раман Курбатаў** і **Аляксандар Саўчанка** затрымалі ўранку 25 сакавіка ў вёсцы Цярэшкавічы, калі ён выпраўляўся ў Гомель, каб удзельнічаць у «Маршы недармаедаў-2». Спачатку завезьлі ў райаддзел, адтуль прэвэнтыўна адправілі ў ізалятар, дзе ён двое сутак правёў за кратамі. У сваіх рапартах службоўцы напісалі: акурат 25 сакавіка ў аграгарадку Цярэшкавічы яны ахоўвалі грамадзкі парадак. Ехалі на аўтамашыне па вуліцах з хуткасьцю ня больш за 20 кілямэтраў у гадзіну і пачулі, што Казлоў гучна крычаў, лаяўся матам. Яны, канечне, спыніліся, папярэджвалі Казлова, але той на заўвагі не рэагаваў.

Такія расповеды выклікалі сьмех і зьдзеклівыя рэплікі на адрас амапаўскіх сьведак. Бо перад гэтым жыхар Цярэшкавічаў **Віктар Тамашоў**, які ішоў з Казловым па вуліцы на прыпынак грамадзкага транспарту, расказаў, як да іх падляцеў міліцэйскі УАЗік. Амапаўцы толькі спыталі прозьвішча ў Казлова і адразу запіхнулі яго ў машыну:

«Я, можа, два крокі зрабіў, як міліцэйская машына з Казловым ад'ехала. Такое толькі ў кіно па тэлевізары бачыў», — казаў суду Тамашоў.

Да таго ж Віктар Казлоў яшчэ 4 красавіка прадставіў суду даведкі з анкалягічнага цэнтру, дзе яму выдалілі паўлёгкага. Пасьля апэрацыі ён наагул крычаць ня можа і размаўляе пераважна шэптам.

Гомельскі палітык **Васіль Палякоў**, які прысутнічаў на судзе і сам адседзеў нібыта за хуліганства 25 сакавіка 8 сутак арышту, лічыць, што штраф Казлову цалкам чаканы, хоць і крыху меншы, чым звычайна:

«Судовая сыстэма цяпер ня можа даваць збоі — яе рыхтуюць да наступных рэпрэсіяў, наступных прысудаў. Наперадзе — даволі цікавы час. Абвастрэньне сацыяльна-эканамічных праблемаў будзе выштурхоўваць людзей на вуліцу. Улады, выкарыстоўваючы міліцыю і суды, будуць гэтаму супрацьдзейнічаць. Таму судзьдзя Застаўнецкая не магла па-іншаму паводзіць сябе, вынесьці іншы прысуд. Судзьдзям даводзіцца ісьці на зьдзелку з сумленьнем, пераступаць цераз сябе і свае прынцыпы і станавіцца саўдзельнікамі рэпрэсіяў, па сутнасьці — саўдзельнікамі злачынства».

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 921 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre memorial

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh











E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

